ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

### *LITERARY SCIENCE*

УДК 821.161.3.09-3
DOI: 10.29235/2524-2369-2018-63-2-221-227

Паступіў у рэдакцыю 24.01.2017
Received 24.01.2017

**А. І. Белая**

*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Баранавічы, Беларусь*

# МАСТАЦКАЯ АНТРАПАЛОГІЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ: ВОБРАЗЫ І ПАНЯЦЦІ

**Аннотация.** Рассматриваются образы-персонажи, имеющие национальную специфику и созданные на основе творческого развития таких традиционных художественных типов, как «маленький человек», «лишний человек», «человек в футляре»; очерчиваются их психологические и ментальные доминанты, особенности идеи и поэтики; акцентируется та сущность типа, которая сближает персонажей разных эпох, различного облика, темперамента, статуса. Выявлен ряд метафорических авторских номинаций человеческих типов/литературных личностей, определена их роль в типологии характеров, эстетическая значимость. Отмечена тенденция литературы переходных эпох к социальной типизации. Обозначено направление трансформации типа-«рефрена» хозяина и авторской концепции собирательных образов в условиях изменившегося мира. Уточняются критерии оценки персонажа как образа и как характера. Исследовано влияние классической и национальной традиций, конкретной социокультурной ситуации на индивидуально-авторское видение человека, что придаёт своеобразие художественной антропологии белорусской прозы первой трети XX века и делает её значительным эстетическим явлением, перспективным для научного исследования.

**Ключевые слова:** образ-персонаж, образ-характер, типический характер, номинация типа, собирательные образы

**Для цитировання.** Белая, А. І. Мастацкая антрапалогія ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя: вобразы і паняцці / А. І. Белая // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2018. – Т. 63, № 2. – С. 221–227. DOI: 10.29235/2524-2369-2018-63-2-221-227

**A. I. Belaya**

*Baranovichi State University, Baranovichi, Belarus*

# ARTISTIC ANTHROPOLOGY IN BELARUSIAN PROSE OF THE FIRST THIRD OF 20th CENTURY: IMAGES AND NOTIONS

**Abstract.** The article deals with the national features of personages created on the basis of such traditionally typified characters as “a small man”, “a superfluous man”, “a man in the case”. The paper considers their psychological and mental dominants, peculiarities of the ideas and poetics. It centers on the feature of type that brings together characters of different times, appearances, temperaments and status. Authors’ metaphorical nominations of human types / literary persons are singled out and their role in the typology of characters and aesthetic value are described. From the perspective of the modified world the type-“refrain” of the owner and the authors’ concepts of the collective images are presented. The analysis of literary process during transitional periods shows its tendency to social typification. The criteria for the evaluation of personage as an image and personage as a character are outlined. It is concluded that the influence of classical and national literary traditions in combination with the specific socio-cultural situation on the individual author’s vision of a man makes it possible to regard the artistic anthropology of Belarusian prose of the first third of the twentieth century not only as the distinctive aesthetic phenomenon but perspective for scientific research.

**Keywords:** image as personage, image as individualized character, typified character, nomination of type, collective image

**For citation.** Belaya A. I. Artistic Anthropology in Belarusian Prose of the First Third of 20th Century: Images and Notions. *Vestsi Natsyianal’nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2018, vol. 63, no. 2, pp. 221–227 (in Belarusian). DOI: 10.29235/2524-2369-2018-63-2-221-227

© Белая А. І., 2018

**Уводзіны.** Найбольш важным ідэйна-эстэтычным складнікам канцэпцыі асобы з'яўляецца сістэма мастацкіх вобразаў-характараў, праз якую актыўна рэпрэзентуецца нацыянальнае ўзнаўленне свету і яго асабовае ўспрыманне. Тыпалогія літаратурных персанажаў – гэта групоўка іх у тыпы на аснове пэўнага падабенства характараў. Істотна, што ёй падпарадкуюцца розныя вобразы-тыпы: і па-мастацку дасканалыя, і ўзоры нарматыўнай эстэтыкі, і «васковыя фігуры» (А. Шапенгаўэр). Найбольш прадукцыйным і адпаведным традыцыі ўяўляецца разуменне тыпу як агульных рыс, або дамінанты індывідуалізаваных характараў персанажаў, або інварыянта, які прасочваецца ў варыяцыях. Рухомасць тыпалогіі персанажаў у пэўнай меры адлюстроўвае змену грамадскіх ідэалаў, каштоўнасных установак, рэпрэзентуе канкрэтна-гістарычны змест асобных эстэтычных катэгорый.

*Мэта даследавання* – удакладненне статусу традыцыйных, класічных, і нацыянальна адметных намінацый літаратурных тыпаў у пераходную эпоху.

*Метады.* Выкарыстаны комплексны падыход з выкарыстаннем супастаўляльнага, гісторыка-культурнага, структурна-семіятычнага метадаў, метадаў рэцэпцыі, інтэрпрэтацыі.

**Асноўная частка.** Пісьменнікі заўсёды ўзводзілі да тыпу нейкае мноства асоб сярод патэнцыяльных прататыпаў у жыцці і літаратуры. К. Чорны, філосаф і псіхолаг, у рамане «Сястра» называе гэта вывучэннем у канкрэтнай асобе «чалавечага тыпу… патрэбнага для якога-небудзь твора, які калі-небудзь, магчыма, будзе напісаны» [1, с. 83]. У іншым фрагменце рамана Казімер Ірмалевіч і Абрам Ватасон «ёмка прышпілілі і вымералі» [1, с. 152] чалавечы тып Ваці Браніслаўца. У рамане ёсць выраз К. Чорнага, які можна разглядаць як кантэкстуальна-сінанімічны да паняцця «тыпалогія» – «катэгорыі людскога падзялення» [1, с. 151]. У літаратуразнаўстве 1930–1950-х гг. панаваў пункт погляду на тыповае, які склаўся пад уплывам вульгарна-сацыялагічнага разумення сутнасці мастацкай творчасці. Тыповае павінна было выяўляць сутнасць сацыяльнага асяроддзя і ў сувязі з гэтым – палітычную пазіцыю пісьменніка. З другой паловы 1950-х гг. пачала сцвярджацца думка, што сутнасць тыповага характару ў літаратуры, як і характару чалавека ў рэальным жыцці, складае агульначалавечы змест, а канкрэтную форму яго выяўлення ўтварае спалучэнне сацыяльна-класавага і індывідуальна непаўторнага.

Характары, асабліва ў творчасці аднаго аўтара, часта выступаюць менавіта як варыяцыі, вынік творчага развіцця аднаго тыпа: вяртаючыся да яго, пісьменнікі знаходзяць у ім новыя грані, дабіваюцца эстэтычнай бездакорнасці адлюстравання. Такім тыпам у беларускай прозе «эпохі рубяжа» з'яўляецца тып селяніна.

Паказчыкам фарміравання тыпу персанажа звычайна выступае яго ўстойлівая намінацыя. Часцей за ўсё яе ўводзіў аўтар, свой унёсак рабілі і крытыкі. Устойлівасць намінацый некаторых беларускіх тыпаў абумоўлена іх фальклорнай прыродай. Сказанае вышэй мае адносіны да тыпу «маленькага чалавека». Я. Колас напісаў пра сваіх герояў: «Мае знаёмыя няўзрачны, / Нічым не слаўны і не значны, / Усё людзі простыя, малыя…» [2, с. 443]. Аднак вялікую распаўсюджанасць у беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя мае і намінацыя «сярэдні» чалавек, што экзістэнцыйна можна ўзвесці да адметнасці ментальнай сферы беларусаў як людзей паміж Усходам і Захадам. «Тое, як трансфармуецца той ці іншы персанаж, калі пераводзіцца на мову чужых уяўленняў, характарызуе і носьбіта мовы, і таго, аб кім ён апавядае», – пісаў Ю. Лотман [3]. Нацыянальна адметны тып – «людзі ў сярэднім пер'і». Часцей ён вылучаецца паводле матэрыяльнага ўзроўню герояў. Такія Боханы ў аповесці Л. Калюгі «Утрапенне»: «Роскашы яны не зналі, але й гора не бачылі» [4, с. 507]. Гаспадарлівасць, ашчаднасць, здольнасць да вядзення складаных практычных спраў – асаблівыя дамінанты людзей у «сярэднім пер'і». Агей і Наталля Рагавыя («Камароўская хроніка») жылі не так ужо і багата, але без хлеба ніколі не сядзелі, займаліся рамяством. «Мусіць, яно і рабіла іх спакойнымі і ўпэўненымі». Мала хто ў вёсцы меў столькі «чалавечай годнасці ў выразе твару», як Агеева жонка [7, с. 287–288]. Важную тыпалагічную ролю адыгрываюць і ментальна-псіхалагічныя характарыстыкі герояў. «Гаравы» Змітра з аповесці Л. Калюгі «Ні госць ні гаспадар», таксама ў «сярэднім пер'і чалавек», усяго сабе шукае сярэдняга, памяркоўнага: «як сявточнага дня, так добрага суседа» [4, с. 265]. Не будзь горкім, а то праплююць, не будзь салодкім, а то праглынуць, – крэда «сярэдняга» чалавека. «Леў Талстой», піша З. Бядуля ў рамане «Язэп Крушынскі», шэсцьдзясят год «ківаўся… між шчырасцю і фальшам. Быў не

халодным і не гарачым, а нейкім цеплаватым» [2, с. 57]. Людзі з «супрацьлеглых лагераў» лічылі яго сваім чалавекам. У «эпоху рубяжа» гэтая намінацыя змястоўна ўзбагачаецца праз спалучэнне традыцыйнага, нацыянальна-прэцэдэнтнага, з канкрэтна-гістарычным. «Малы чалавек» паступова робіцца «чалавекам “пасярэдзіне”, г. зн. на перасячэнні розных поглядаў, ацэнак, звернутых да яго запытаў; чалавекам, які стаіць перад неабходнасцю выбару і пакідае за сабой права не толькі на гэты выбар, але і на выхад у экзістэнцыйную, не дэтэрмінаваную ніякімі знешнімі абставінамі сферу» [5].

Са зменай культурна-гістарычнай парадыгмы адны персанажы зусім знікаюць, іншыя трансфармуюцца: робяцца «героямі часу», дэманізуюцца або ператвараюцца ў стэрэатыпы ці аб’ект пародый. Гэтыя працэсы ўплываюць і на асэнсаванне асноўных эстэтычных катэгорый: гераічнае, трагічнае, камічнае, рамантычнае і інш. У межах даследаванага намі хранатопу заўважна трансфармацыя ўяўленняў пра такі тып персанажа, намінаваны І. С. Тургеневым, як «лішні чалавек», – адзін з вядучых тыпаў у творчасці пісьменніка, прадстаўлены цэлай галерэяй вобразаў-характараў. У традыцыйным разуменні гэта горды адзінокі індывідуаліст. «Лішнія людзі» ў рускай класіцы выступаюць пераважна аб’ектам псіхалагічнага паказу. Іх яднае адчужэнне ад асяроддзя і ў той жа час глыбокая незадаволенасць сабой, «разлад слова і справы» [6, с. 204]. У беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя псіхалагізм у паказе «лішняй» гераіні выявіла А. Пашкевіч. Фарміраванне асобы залежыць ад характару яе жыццядзейнасці, што дае аб’ектыўныя падставы для сацыяльнай тыпізацыі (а героі пераходных эпох часцей прадстаўлены ў іх сацыяльных ролях). З сялянскага пункту погляду, выказанага ў рамане П. Галавача «Праз гады», тады ты лішні чалавек на зямлі, калі не маеш на ёй свайго ўласнага месца ці «калі вузак твой шнур на ёй. Зямля таго любіць, хто цвёрда на ёй стаіць, хто шырокім крокам мерае на ёй сваю часціну» [7, с. 143]. Аднак ва ўмовах «эпохі рубяжа» пагроза стаць «лішнімі» павісае якраз над тымі героямі, якіх любіць зямля-ніва. Гэта ўцекачы-выгнанцы часоў Першай сусветнай і, пазней, – моцныя гаспадары. Вінцэнты палохае Лявона Бушмара, што хутка пазганяюць з месцаў хутаранцаў: не будзе «ні хаткі, ні градкі». А Лявон не хоча апынуцца ў нейкай няпэўнай якасці ў калгасе, «за адным [агульным] катлом…» [8, с. 27].

У часы калектывізацыі да тыпу «лішніх» далучаецца шэраг сацыяльных падтыпаў: «нехацімцы», «выхадзімцы» («найболей хісткія людзі…» [9, с. 174], «адступнікі» [9, с. 205]). Урэшце ўзнікае такая сацыяльна-прававая катэгорыя савецкіх грамадзян, як «лішэнцы». Юрку Чыкілевіча (аповесць Я. Коласа «Адшчапенец») «вычысцілі» з ветэрынарнай школы як сына кулака-лішэнца, і «нічога пэўнага не было ў Юркі» [9, с. 213]. Меўся паехаць на лесараспрацоўкі, але бацькі не хацелі адпускаць так далёка і на такую цяжкую работу. Толяк Сегенецкі («Ідзі, ідзі» К. Чорнага) пакутліва, але марна шукае магчымасці ўпісацца ў новую рэчаіснасць, не разбураючы пры гэтым ні свайго свету, ні звыклага ўяўлення пра яго, «не ломячы сябе» [8, с. 219]. Такім выйсцем яму бачыцца паветраны флот, і ён пачынае апантана марыць аб «вольнай дарозе», якая прывядзе яго туды, дзе ўсё ідзе гэтак, як ён прывык змалку. Але думкі Толяка хутка цверазеюць, бо «яму самому ходу няма. І чырвоны генерал, і выдатны лётчык, і ўсё, усё – толькі мары. Трэба нічым не адзначацца ад усіх гэтых навакольных сельсаветчыкаў, камітэтчыкаў, лапцявозаў…» [8, с. 221].

Лішнім чалавекам адчуў сябе пасля рэвалюцыі прафесар Галынскі («Праз гады»), у якога ў жыцці ўжо «не было свайго месца, трэба было шукаць яго» [7, с. 271]. Прычынай адчужэння асобы ад асяроддзя маглі служыць у новым часе і яе каштоўнасна-ідэалагічныя арыенціры. Чырвонаармеец («На варце» З. Бядулі), які, паводле самахарактарыстыкі, такі ж самы чалавек, як і хутаранцы на памежжы: «са шчырасцю цягнецца да людскога шчасця, са шчырасцю спачувае чалавечаму гору…», – усё ж разумее, што ён, бязбожнік, тут «лішні чалавек» [10, с. 126]. Лішнімі ў прагматычна арыентаваным асяроддзі, асабліва ў часы змагання «за інтарэсы жывата» (Я. Колас), рабіліся «неграмадскія людзі», асобы «сацыяльна неаформленых» прафесій – творцы і філосафы, прыхільнікі адзіноты. Гэта ўбачыў у сваім сыне бацька Я. Коласа. Не жадаючы сыну пісарскай долі, ён бачыў, што «гаспадара з хлопца таксама не будзе. Хоць ён і рупны, і старанны, а пра сваё думае, усё цікуе, каб аднаму застацца» [11, с. 59]. Грэе надзею, што сын усё ж прыахвоціцца да гаспадаркі, Ігналя Чвардоўскі («Ні госць ні гаспадар»). Але гэты шлях не для творчай асобы. Мы ўключылі ў тыпалогію дзіцячых вобразаў такі персанаж,

як «запячкоўскае дзіцям» [4, с. 243]. З яго фарміруецца «лішні чалавек» тыпу Сымона-музыкі. У кожным асобным выпадку гэта вобраз-характар, які не ўзыходзіць да абагульненага тыпу «запечны народ» (такі мастацкі адменнік паняцця «непасіянарны» выкарыстаў К. Чорны – «Толькі слава тая, што народ» [1, с. 348]). А. Бабарэка ў нататках часоў выгнання ставіць знак роўнасці паміж намінацыямі «лішні чалавек» і «ні госць ні гаспадар». Апошняя прад'яўлена назвай аповесці Л. Калюгі, а таксама сустракаецца ў творах К. Чорнага і Л. Родзевіча. (Адзначым, што згаданая намінацыя ў творах метафарызуецца не заўсёды. Герой рамана К. Чорнага «Зямля» заўважае: мужчына без бабы «ў хаце ні госць ні гаспадар…» [1, с. 420].)

Адчужэнне ад традыцыйнага асяроддзя і яго каштоўнасцей у рознай форме перажываюць маладыя героі Л. Калюгі. Часта яны самі выводзяць сябе за межы традыцыі. «Сялянскія інтарэсы былі даўно чужыя Корабачу» [4, с. 147], на разрыў з жыццёвымі і маральнымі прыярытэтамі сваёй сям'і ідзе Бладзік Мотуз. Аднак Л. Калюга вылучае тып «ні госць ні гаспадар» не толькі паводле псіхалагічных ці сацыяльных дамінант. Гэта сродак рэалізацыі ідэй і каштоўнасцей, значных для аўтара. У творы закладзена глыбокая думка пра асабовую недапраяўленасць герояў і абазначаны вектары іх непазбежнай дынамікі ў бок Дабра або Зла. Паўтаральны тып асобы адносна ўласнасці мае назву «рэфрэн». Беларускай прозе ў цэлым уласцівы «рэфрэн» гаспадара. Ён выяўляе ідэал асабістых паводзін і іх вынік («Няма лепшага панства, чым гаспадарства…»). Але ў працэсе карэнных змен форм уласнасці ідэя і паэтыка гэтага вобраза адчуваюць шэраг трансфармацый. «Ні гаспадары, ні парабкі» [12, с. 173] – гэта сям'я Загонаў на няўдзячнай ніве ў рамане Ц. Гартнага «Сокі цаліны». Калюгаў Арсей Анцішэўчык да пачатку калектывізацыі яшчэ «сам сабе гаспадар» [4, с. 173]. Чыкілевіч у Я. Коласа («Адшчапенец») – «абароцісты, смякалісты чалавек, спрытны гаспадар, жыве наводшыбе». Як вынік – «індывідуальна абложаны… і лічыць, што з ім паступілі несправядліва» [9, с. 117]. Тып-«рэфрэн» гаспадара, зрабіўшыся анамальным у сістэме сацыяльна-эканамічных адносін, рабіўся заганным у эстэтыцы, а ў рэчаіснасці падлягаў вынішчэнню. Нездарма ў рамане З. Бядулі паказана, што гаспадарчыя поспехі Крушынскага абумоўлены ў асноўным асабістымі здольнасцямі, а не пакліканнем часу. Праўда, З. Бядуля ўрэшце вымушаны быў скіраваць гэтыя здольнасці і адносіны ў некампліментарны для героя кантэкст. І Чыкілевіч у аповесці Я. Коласа таксама робіцца «сам сабе больш не гаспадар» [9, с. 213].

Чалавек – важнейшы аб'ект мастацкага адлюстравання. Адносна яго правамоцныя толькі два віды ацэнкі: фактурная (добры або злы, сквапны ці шчодры, разумны ці дурны…) і крытэрыяльная (Саюзнік, Вораг, Свой, Чужы, Іншаземец, Прыхадзень…). Гэта ацэнкі-эталоны, устойлівыя, архетыпавай прыроды, вобразы. У аснове «класавага падыходу» ляжыць «дысбаланс ацэнак з перавагай крытэрыяльнай ацэнкі над фактурнай» [13, с. 39]. У рамане М. Зарэцкага «Вязьмо» ёсць калізія, дзе фактурная ацэнка з цяжкасцю саступае крытэрыяльнай: Вера Засуліч гвалтам вымушае сябе глядзець на Гвардыяніху як на класавага ворага.

Згаданая калізія нясе таксама ідэю супраціўлення «футлярнасці» як «адназначнасці формы» (І. Канчэўскі). Ключавое слова «футляр» у А. Чэхава ўпершыню з'яўляецца пры апісанні знешнасці героя, дакладней, яго касцюма. Былы настаўнік «савслуж» Высаковіч у рамане Л. Калюгі «Пустадомкі» апрануты ў фрэнч. Гэтая дэталь адзення набывае, як і «футляр», уласцівую сімвалу мнагазначнасць. Думкамі і паводзінамі «чалавека ў фрэнчы» таксама кіруюць шаблон, цыркуляр, інструкцыя, але ўжо значна больш пагрозлівыя. Думка, скаваная догмай («формай»), а таксама навязванне, мякка ці гвалтоўна, сваёй мадэлі паводзін іншым складаюць сутнасць «футлярнага» [14, с. 25] тыпу, якая збліжае персанажаў, розных па характары, тэмпераменце, сацыяльным становішчы, прафесіі, сведчыць пра нераз'яднанасць, «роднаснасць» рабства і дэспатызму. Пры гэтым важная менавіта ўзаемасувязь гэтых якасцей, устойлівы псіхалагічны комплекс, а не асобна ўзятая рыса. І. Мележ некалькімі трапнымі штрыхамі акрэсліў падобную сутнасць Башлыкова. Аднак пераклічка асобных матываў і дэталяў не азначае аднатыпнасці герояў. На першы погляд, «футлярную» сутнасць маюць Самсон Самасуй у «Запісках…» А. Мрыя і Лявон Пісака ў апавяданні Л. Родзевіча «Марксісцкі аршын». Але абодва аўтары процістаўляюць ёй здаровы сэнс, «сыры», «земляны» мужыцкі розум. Ціск «формы» паслабляецца камічным пафасам.

Героі розных эпох, якія адрознымі шляхамі ідуць да свабоднага самавыяўлення і свабоднага ўзаемадзеяння са светам, выяўляюцца героямі трагічнымі. Паміж імі ўзнікае нечаканая, але, па сутнасці, заканамерная пераклічка. Шапавалаў-Мятлоў («Язэп Крушынскі») трапляе ў сітуацыю трагічнага героя (Эдыпа), які спачатку ўпэўнены: можна пазбегнуць лёсу – трэба толькі сысці з гэтых мясцін, з горада, дзе жывуць людзі, перад якімі ён мае віну. Герой нібыта бярэ свой лёс у свае рукі, робіць яго прадметам асабістай энергічнай дзейнасці, волі. Быццё суб'ектывуецца, убіраецца ў чалавека і адсюль узнаўляецца. Але тым самым рэальныя быццёвыя цяжкасці і праблемы, якія здаваліся спачатку існуючымі па-за чалавекам, па-за «я» і лёгкапераадольнымі, калі пачаць жыць «з сябе», свядома, – раптам усплываюць ужо знутры, як уласныя цяжкасці асобы і яе думкі. Прыходзіць час, калі герой, паводле выразу Г. Гачава, «спыняе рух і пачынае даследаваць сам матор» [15, с. 48].

Чалавечыя характары ў мастацкай творчасці выступаюць не толькі як прадмет пазнання, а і як прадмет, праз які мастак уступае ў канкрэтна-пачуццёвыя зносіны са светам у цэлым, ажыццяўляючы яго мастацкае асваенне. Для гэтага мастаку неабходна выявіць усеагульнае значэнне характэрнага, што магчыма толькі дзякуючы тыпізацыі. Расійскія даследчыкі адзначаюць, што пісьменнікі XIX стагоддзя «мыслілі тыпамі» [14, с. 24]. Гэтую традыцыю ў пэўнай меры ўспрынялі беларускія празаікі ў першай трэці XX стагоддзя. Намінацыямі літаратурнага тыпу часта робяцца трапныя метафары. Асобныя з іх адсылаюць да творчасці пісьменнікаў, якія неаднаразова вярталіся да прывабнага для іх тыпу. Сёмка Загон у Ц. Гартнага – «палявы чалавек»; Павел Зыкаў-Росяк у Я. Нёманскага – «няпэўны чалавек», Самсон Самасуй у А. Мрыя – «паветраны чалавек» і інш. Цэлы шэраг адметных намінацый увёў у айчынную прозу Л. Калюга: «краўцы і чаляднікі»; «штучны чалавек»; «капераціўскі сабака», «пустадомкі». У люстэрку трапных намінацый адбіваецца рухомая тыпалогія персанажаў. «Пустадомкі», асобы без прытулку, зямлі і рамяства, у К. Чорнага пазнаюцца пад іншай намінацыяй: «Калі гэта ўсё нясталыя людзі! За плячыма павінна што-небудзь у чалавека быць, каб заўсёды прыперціся да чаго льга было» [1, с. 389]. Канкрэтная асоба, Мікалай Жыгунец, у рамане «Зямля» характарызуецца трапна-знішчальна: «Гэта не чалавек, а валацуга, пасвісцёл нейкі, бізун, брадзяга» [1, с. 389].

Прыметай стылю многіх твораў, звязаных з часамі грамадскіх трансфармацый, з'яўляюцца збіральныя вобразы. Іх існаванне выяўляе цікавасць пісьменнікаў да агульнага ў розных абліччах. Гэты ракурс паказу чалавека абумоўлены з XIX стагоддзя цікавасцю да праблем народнасці, сацыяльнай псіхалогіі. У ранняй савецкай літаратуры збіральныя вобразы часцей адыгрывалі ідэалагічна-кан'юнктурную, а не эстэтычную ролю, выступаючы прыёмам «сакралізацыі» тэмы народа. Вобразы-карціны натоўпу, мітынгу, сходу і іншыя масавыя сцэны ствараліся на аснове мастацкага сінтэзу рысаў ці рэплік многіх, часта безыменных, асоб, паказаных у сацыяльна-гістарычным аспекце. Асобныя з іх ужо згадваліся намі (камітэтчыкі, актывісты, «нехацімцы», «выхадзімцы» і да т. п.). Персанаж як характар, з аднаго боку, і як вобраз – з другога, маюць розныя крытэрыі ацэнкі. У адрозненне ад характараў, якія падлягаюць ацэнцы ў святле тых або іншых этычных ідэалаў, вобразы ацэньваюцца перш за ўсё з эстэтычнага пункта погляду, г. зн. у залежнасці ад таго, наколькі яскрава, поўна ў іх выяўлена творчая канцэпцыя. Месца абагульненага вобраза-тыпу «добрых людзей» у беларускай прозе можна вызначыць на памежжы этыкі і эстэтыкі. У празаічных творах сустракаюцца розныя варыянты пытання: «Дзе яны ёсць, тыя добрыя людзі?» [4, с. 141]. Пётру Хвалісінаму («Ні госць ні гаспадар») абрыдла матчына казань пра «добрых» ды «чужых» людзей: «Многа гаворкі пра іх. Толькі ні разачку бачыць іх на свае вочы не траплялася» [3, с. 104]. Не менш горкай іроніі ў развагах старога Ярэмчыка («Язэп Крушынскі»). Кароўку Падласую за добрыя якасці яе натуры «можна было параўнаць да вельмі добрага чалавека, якіх Цыпрук у жыцці мала бачыў» [16, с. 413]. Шмат іх, аднак, сярод калюгаўскіх баркаўчан, вобразы якіх выклікаюць і эстэтычныя пачуцці. Гэта людзі «разумныя і змыслыя»; «крыху дзіўныя»; «гаваркія і язычлівыя» – няма людзей лепшых, як баркаўчане! Яны ж і «…людзі трывалыя: што ім жаласнае ні гавары, будуць слухаць, падцмокваць, памогуць біду бедаваць, а слязы з вока не ўпусцяць» [4, с. 62]. А здарыцца каму без нагляду сахор ці сякеру пакінуць, то нават «самы лепшы, павяроны чалавек» так іх у сябе дома прыхавае, што хоць спалі таго чалавека, то і на папялішчы сваёй рэчы не знойдзеш. Таму падзел паміж

«добрымі» людзьмі, «так сабе» людзьмі і людзьмі-злодзеямі досыць умоўны… М. Лынькоў у рамане «На чырвоных лядах» дае адчуць розніцу паміж «добрымі» людзьмі і добрым чалавекам. Сяргей выклікае асуджэнне «моцных» гаспадароў за тое, што нават у касавіцу цягаецца з вудзільнам, і атрымлівае прысуд: «Нялюдскі ён». Але калі рыбак вылавіў цела забітага панскім леснікам Лявона Ражка, то аднавяскоўцы ўсе «ціхенька-ціхенька ды падаліся хто куды, па сваіх справах», пакінуўшы яго ў вялікім абурэнні: «Ну й народ, ну й людзі. Вот табе, беднаму чалавеку, і памры, дык і пабягуць усе, у вочы табе зірнуць пабаяцца, вочы твае прыплюшчыць…» [17, с. 405]. Надзвычай катэгарычны ў ацэнцы «добрых» людзей Т. Шаўчэнка: «Не так тыя ворагі, / Як добрыя людзі – / І абкрадуць, шкадуючы, / Плачучы, асудзяць, / І запросяць цябе ў хату, / І будуць вітацца, / І распытваць цябе будуць, / Каб потым смяяцца…» [18, с. 170]. Радзівон Цівунчык («Сястра») называе Вацю Браніслаўца «л*ю*дскі чалавек» [1, с. 255]. Гэтую намінацыю нельга выкарыстаць адносна множнасці асоб, у форме «л*ю*дскія людзі». За ёй бачыцца ўнікальнасць, адзінкавасць, індывідуальнасць, не правіла, а выключэнне ў людской грамадзе. І калі спалучэнне «добрыя людзі» гучыць у большасці выпадкаў з іроніяй, то назоў «л*ю*дскі чалавек» яе не дапускае ў прынцыпе.

Толькі аўтарская канцэпцыя пераўтварае ў сістэму характараў сукупнасць персанажаў мастацкага твора. Яе разуменне непазбежна змяшчае элемент суб'ектыўнасці. Але ўсе інтэрпрэтацыі – і адэкватныя канцэпцыі аўтара, і палемічныя адносна яе – павінны ажыццяўляць падыход да «літаратурных асоб» у святле сэнсавага адзінства твора.

**Заключэнне.** Персанажную сферу беларускай прозы першай трэці ХХ стагоддзя перш за ўсё і галоўным чынам складаюць сацыяльна-гістарычныя тыпы, але выключна сваёй тыповасцю яны не вычэрпваюцца. Знакам тыпу персанажа выступае яго ўстойлівая намінацыя, у якой адлюстроўваецца дамінанта індывідуалізаваных характараў. На статус намінацыі тыпу прэтэндуюць многія назвы твораў беларускай прозы першай трэці ХХ стагоддзя, а паказчыкам доўгажыцця тыпаў у літаратуры з'яўляецца частотнасць адпаведных намінацый у розных кантэкстах. Яна, у сваю чаргу, вызначаецца мерай агульначалавечага ў змесце вобраза, што не выключае яго нацыянальнай адметнасці. Беларускі «малы» чалавек – часцей за ўсё герой «у сярэднім пер'і». Адметную асабовую сутнасць у пераходную эпоху адлюстроўвае дэфініцыя «ні госць ні гаспадар» (Л. Калюга, К. Чорны, Л. Родзевіч). Апошняя ступень дэструкцыі асоб гэтага тыпу – «пустадомкі». Абагульнены тып «добрых людзей» прад'яўляецца пераважна ў іранічным дыскурсе (М. Лынькоў, Л. Калюга, К. Чорны, Т. Шаўчэнка). У пераломны час размываецца статус традыцыйных намінацый, у характары героя акцэнтуецца сацыяльны складнік («лішні чалавек»). «Чалавек у фрэнчы» выяўляецца варыянтам «футлярнага» персанажа (Л. Калюга, І. Мележ). Адметнасць экзістэнцыі літаратурных герояў гэтага часу зближае іх з трагічнымі героямі сусветнай класікі (З. Бядуля). Традыцыйныя вобразы і іх мастацкія варыянты выяўляюць дыялектыку асабовага, аўтарскага ўспрымання свету і адметнасці нацыянальнага светабачання.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Чорны, К. Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. – Мінск: Маст. літ., 1973. – Т. 3: Раманы. – 544 с.

2. Колас, Я. Вершы. Паэмы. Апавяданні. Аповесці. Трылогія "На ростанях" / Я. Колас; прадм. М. Мушынскага. – Мінск, 2007. – 1168 с.

3. Лотман, Ю. Структура художественного текста / Ю. Лотман [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://royallib.com/book/lotman_yuriy/struktura_hudogestvennogo_teksta.html. – Дата доступа: 10. 08.2016.

4. Калюга, Л. Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты / уклад., прадм. Я. Лецкі; камент. Н. В. Гаўрош, Т. М. Трыпуцінай /Л. Калюга. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 607 с.

5. Ребель, Г. М. Герои и жанровые формы романов Тургенева и Достоевского (Типологические явления русской литературы XIX века): автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.01.01 / Г. М. Ребель. – Ижевск, 2007 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://search.rsl.ru/ru/record/01003158320. – Дата доступа: 17. 05. 2010.

6. Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В. М. Кожевникова, П. А. Николаева. – М.: Сов. Энцикл., 1987. – 752 с.

7. Галавач, П. Праз гады / П. Галавач. – Мінск: Маст. літ., 1984. – 368 с.

8. Чорны, К. Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. – Т. 4: Аповесці і раманы. – Мінск: Маст. літ., 1973. – 496 с.

9. Колас, Я. Адшчапенец / Я. Колас // Збор твораў: у 20 т. Т. 12: Аповесці; рэд. тома Т. С. Голуб, М. І. Мушынскі; падрыхт. тэкстаў і камент. Т. Р. Строевай; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – 518 с.

10. Бядуля, З. Апавяданні / З. Бядуля; уступ. арт.: І. Кудраўцаў. – Мінск: Нар. асвета, 1973. – 160 с.
11. Лужанін, М. Колас расказвае пра сябе / М. Лужанін // Выбраныя творы: у 2 т. – Мінск: Маст. літ., 1993. – Т. 2. – 526 с.
12. Гартны, Ц. Сокі цаліны: Раман у чатырох квадрах / Ц. Гартны. – Т. 1. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1957. – 479 с.
13. Бондырева, С. К. Толерантность (введение в проблему) / С. К. Бондырева, Д. В. Колесов. – М.: Изд-во Моск. соц.-психол. ин-та; Воронеж: Изд-во НПО "МОДЭК", 2003. – 240 с.
14. Чернец, Л. В. Человек в футляре: литературный тип и его вариации / Л. В. Чернец // Русская словесность. – 2014. – № 2 – С. 24–31.
15. Гачев, Г. Д. Содержательность художественных форм. Эпос. Лирика. Театр / Г. Д. Гачев. – М.: Изд-во Моск. ун-та; Изд-во «Флинта», 2008. – 288 с.
16. Бядуля, З. Язэп Крушынскі: Раман. Кн. 2 / З. Бядуля // Збор твораў: у 5 т. Т. 5. – Мінск: Маст. літ., 1989. – С. 5–249.
17. Лынькоў, М. Над Бугам: Апавяданні, аповесці, урыўкі з рамана / М. Лынькоў; уклад. З. Пазняк. – Мінск: Маст. літ., 2002. – 446 с.
18. Шаўчэнка, Т. Р. І мёртвым, і жывым, і ненароджаным…: вершы, паэмы, балады / Т. Шаўчэнка; прадм., падрыхт. тэкстаў, уклад., камент. Т. Кабржыцкай, В. Рагойшы. – Мінск: Маст. літ., 2014. – 656 с.

## References

1. Chorny K. *Works. Vol. 3. Novels*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1973. 544 p. (in Belarusian).
2. Kolas Ya. *Verses. Poems. Stories. Tales. The trilogy "At the Crossroads"*. Minsk, Kharvest Publ., 2007. 1168 p. (in Belarusian).
3. Lotman Yu. *The structure of the literary text*. Available at: http://royallib.com/book/lotman_yuriy/struktura_hudogestvennogo_teksta.html (Accessed 10 august 2016) (in Russian).
4. Kalyuga L. *Works: novel, novels, short stories, letters*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1998. 607 p. (in Belarusian).
5. Rebel G. M. *Heroes and genre forms in Turgenev's and Dostoevsky's novels (The typological features of Russian literature of the XIX century)*. Izhevsk, 2007. 45 p. (in Russian).
6. Kozhevnikov V. M., Nikolayev P. A. (eds.) *Literary encyclopedic dictionary*. Moscow, Bol'shaya Sovetskaya entsiklopediya Publ., 1987. 752 p. (in Russian).
7. Galavach P. *Years later*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1984. 368 p. (in Belarusian).
8. Chorny K. *Collected Works. Vol.4. Stories and novels*. Mastatskaya litaratura Publ., Minsk, 1973. 496 p. (in Belarusian).
9. Kolas Ya. *Collected Works. Vol. 12: Tale.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2010. 518 p. (in Belarusian).
10. Byadulya Z. *Stories*. Minsk, Narodnaya asveta Publ., 1973. 160p. (in Belarusian).
11. Luzhanin M. *Selected Works. Vol. 2: Kolas tells about himself.* Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1993. 526 p. (in Belarusian).
12. Gartny Ts. *Juices of virgin land : a novel in Four squadra. Vol. 1.* Minsk, State Publishing House of the Byelorussian SSR, 1957. 479 p. (in Belarusian).
13. Bondyreva S. K., Kolesov D. V.*Tolerance (introduction to the problem).* Moscow, Publishing house of the Moscow State University of Psychology and social; Voronezh: MODEK Publ., 2003. 240 p. (in Russian).
14. Chernets L. V. Man in a Case: literary type and its variations. *Russkaya slovesnost* [Russian Literature], 2014, no. 2, pp. 24–31 (in Russian).
15. Gachev G. D. *Richness of artistic forms. Epoch Times. Lyrics. Theater*. Moscow, Publishing house of the Moscow State University, 2008. 288 p. (in Russian).
16. Byadulya Z. *Collected Works. Vol. 5 :Yazep Krushinsky. Novel.* Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1989. 249 p. (in Belarusian).
17. Lyn'kou M. *Above Bug :stories, excerpts from the novel*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 2002. 446 p. (in Belarusian).
18. Shaŭchenka, T. R. *And the dead and the living, and the unborn ... : poems, ballads,* Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 2014. 656 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Белая Елена Ивановна** – кандидат педагогических наук, доцент, профессор кафедры филологии. Барановичский государственный университет (ул. Войкова, 21, 225404, Барановичи, Республика Беларусь). E-mail: alba.57@mail.ru

## Information about the author

**Elena I. Belaya** – Ph. D. (Pedagog.), Associate Professor, Professor of the Department of Philology, Baranovichi State University (21 Voikov Str., Baranovichi 225404, Belarus). E-mail: alba.57@mail.ru